Сацыяльны аспект

# На новы ўзровень

## Работа па абнаўленні ФАПаў актыўна вядзецца на Піншчыне

**Пасля майскай нарады па актуальных пытаннях аховы здароўя работа па навядзенні парадку, рамонту і абнаўленні сельскіх устаноў аховы здароўя прыкметна актывізавалася. Напрыклад, у Пінскім раёне з 39 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, якія функцыянуюць на тэрыторыі, цалкам прыведзена ў парадак 28. Некаторыя з устаноў перажылі вялікі рамонт і рэканструкцыю, асобныя наогул справілі наваселле.**


Падчас адкрыцця ФАПа ў Новым Двары.

Тры з іх былі ўрачыста адкрыты ў гэтым месяцы. Не проста камфортныя ўмовы, але і новы ўзровень як аказання, так і атрымання медыцынскіх паслуг цяпер у медработнікаў і пацыентаў ФАПаў у аграгарадку Новы Двор, вёсках Чухава і Кашэвічы. Як адзначыў намеснік старшыні Пінскага райвыканкама Дзмітрый ПАЛХОЎСКІ, упор зроблены на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, рамонт будынкаў, замену інжынерных камунікацый, даху.

— Работы вяліся ўнутры памяшканняў і звонку. Дзе патрабавалася, абнавілі мэблю і абсталяванне. Асвоена ўжо больш за 700 тысяч рублёў бюджэтных сродкаў. Робіцца ўсё, каб жыхары вёскі не адчувалі сябе абдзеленымі ў плане медыцынскай дапамогі ў параўнанні з гараджанамі, — гаворыць Дзмітрый Георгіевіч.


Тут размясцілі ФАП у Чухаве.

У Новым Двары на адкрыццё ФАПа сабралася шмат людзей. Фельчарска-акушэрскі пункт памяняў дыслакацыю, са старога будынка ён пераехаў у новы. Для гэтага бібліятэку перанеслі ў іншае крыло Цэнтра культуры і адпачынку, а на яе месцы ўладкавалі медустанову. Калі ў ранейшым ФАПе не было ні вады, ні каналізацыі, то тут усе зручнасці ёсць. І цяпер можна гаварыць пра сучасную ўстанову аховы здароўя.

Работу паспяхова правялі спецыялісты філіяла СУ-138 ААТ «Будтрэст № 2». Як і належыць медыцынскай установе, перад уваходам усталяваны пандус, для чаго спатрэбілася зрабіць цалкам новы ганак. Унутры была праведзена перапланіроўка, абноўлены столь, падлога, сцены, зроблена добраўпарадкаванне. Будаўнікі на гэтым аб'екце выступілі не толькі ў якасці падрадчыкаў, але і спонсарамі, на абсталяванне выдаткавалі 60 тысяч рублёў.

Як паведаміла загадчыца ФАПа Ала ГУЗАРЭВІЧ, цяпер іх установа мае ўсе выгоды, не трэба паліць печ, як было раней. Яшчэ з'явілася новае абсталяванне: партатыўны кардыёграф, апарат для вымярэння ўнутрывочнага ціску, іншыя патрэбныя прылады, у ліку якіх, напрыклад, электронныя вагі, асобна для дзяцей і дарослых. Цяпер маецца ўсё для таго, каб прымаць пацыентаў на адпаведным узроўні і праводзіць якасную дыспансерызацыю.

Паводле слоў кіраўніка справамі Навадворскага сельскага Савета Людмілы МАРЧУК, падчас адкрыцця людзі выказвалі падзяку за тое, што медыцынскую ўстанову размясцілі ў самым цэнтры. Раней яна была ўсё-такі наводдаль, а цяпер усё ў адным месцы: ФАП, крамы, пошта, іншыя сацыяльныя аб'екты, а гэта зручна.

У Навадворскім сельсавеце, дарэчы, у адзін дзень адзначылі наваселле адразу два ФАПы, другі — у вёсцы Чухава. Тамтэйшая ўстанова таксама набыла новы выгляд пасля рамонту. Абслугоўвае фельчарска-акушэрскі пункт 786 чалавек, што на сотню болей, чым нават у Новым Двары. І там медустанова размяшчаецца ў вялікім будынку Дома культуры ў цэнтры вёскі.

Як падкрэсліў начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Пінскага райвыканкама Юрый БУШЫК, урачыстае адкрыццё медыцынскіх устаноў прымеркавалі да Дня народнага адзінства найперш для таго, каб правесці гістарычную паралель. Згодна з архіўнымі дакументамі, фельчарска-акушэрскія пункты ў Пінскім раёне адкрывалі ў 1939—1941 гадах і пасля вайны. Такім чынам, пасля ўз'яднання Беларусі медыцына па-сапраўднаму зрабіла крок у бок вёскі.

Старшыня Пінскага раённага Савета дэпутатаў Вячаслаў ЛАЗЮК сказаў, што гэтую патрэбную справу адолелі ўсёй грамадой:


Будынак ФАПа ў Новым Двары.

Фота Навадворскага сельвыканкама.

— Падключылася мясцовая ўлада. Не засталіся ўбаку ад важнай дзяржаўнай справы сельгаспрадпрыемствы, будаўнічыя арганізацыі горада і раёна. І на ўрачыстым адкрыцці горача падзякавалі іх калектывам, многіх людзей адзначылі граматамі, падзячнымі пісьмамі райвыканкама і раённага Савета.

Большасць фельчарска-акушэрскіх пунктаў паспяхова працуе пасля рамонту. Як, напрыклад, ФАП у Беразцах, адзін з самых аддаленых у раёне. Раней медустанова туліліся ў старым будынку без вады, іншых камунальных зручнасцяў. Цяпер там ёсць усё, у памяшканні светла і ўтульна. Работа працягваецца на астатніх ФАПах, якія ўжо гатовы амаль на 90 працэнтаў. Наперадзе — клопат пра абнаўленне амбулаторый урача агульнай практыкі, участковай бальніцы сястрынскага догляду.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

---

Спажывец

# Сельгаскірмашы чакаюць мінчан

## Даведаліся, як і дзе яны працуюць

**У сталіцы стартаваў сезон сельскагаспадарчых кірмашоў. Яны пачалі працаваць на мінулым тыдні ў кожным раёне горада. Самы буйны разгарнуўся на пляцоўцы каля «Чыжоўка-Арэны». Аб гэтым распавяла начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Алена НАГОРНАЯ.**




«Тут гандлююць найбольшая колькасць фізічных асоб і сялянскіх фермерскіх гаспадарак. Таксама там прымаюць актыўны ўдзел вытворцы мясной прадукцыі і іншыя прадпрыемствы перапрацоўчага комплексу нашай краіны», — адзначыла Алена Нагорная.

У кожным раёне сталіцы па выхадных днях арганізоўваюцца кірмашы. Вылучаецца Кастрычніцкі раён, у якім задзейнічаны дзве пляцоўкі. Партызанскі раён таксама абраў сваю спецыфіку: ужо трэці год запар лакацыі кожныя выхадныя змяняюцца. Гэта зроблена для зручнасці жыхароў, для таго, каб абсалютна кожны меў магчымасць бліжэй да дома набыць усё неабходнае.

На кірмашах працуюць валанцёры. Студэнты арганізоўваюць бясплатную дастаўку асобам сталага ўзросту і інвалідам тых рэчаў, якія яны набываюць. «Мы за гэтым старанна сочым, каб нікога не пакрыўдзіць і аказаць якасную паслугу, — падкрэсліла начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг. — Хачу звярнуць увагу жыхароў Мінска: акрамя кірмашоў, якія працуюць па выхадных, арганізавана работа 105 пляцовак, якія з 18 верасня працуюць штодня. Плануецца, што пры спрыяльных умовах надвор'я яны будуць функцыянаваць да 15 лістапада. Гандлёвыя пункты размешчаны такім чынам, каб мінчане мелі магчымасць увечары пасля работы набыць плодаагародніннную прадукцыю. У асноўным на іх працуюць тыя ж гандляры, якія ўдзельнічаюць і на кірмашах у выхадныя дні».


Фота БелТА.

Алена Нагорная нагадала пра новаўвядзенне ў падатковым заканадаўстве, якое тычыцца юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць рознічны гандаль на кірмашах і на гандлёвых месцах: «Сялянскія фермерскія гаспадаркі і індывідуальныя прадпрымальнікі абавязаны мець пры ажыццяўленні гандлю на кірмашах касавае абсталяванне. На фізічных асоб, не зарэгістраваных у якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ўдзельнічаюць у кірмашах і маюць даведку аб тым, што ў іх ёсць прысядзібны ўчастак і там яны вырошчваюць пэўную прадукцыю, гэта не распаўсюджваецца».

Па словах Алены Нагорнай, за двое адпрацаваных выхадных па сельгаскірмашах тавараабарот склаў больш за 730 тысяч беларускіх рублёў. «Мы абавязаны забяспечыць жыхароў сталіцы якаснай беларускай плодаагароднiннай прадукцыяй. Таму тавараабарот, лічу, дастаткова нядрэнны. Але разам з тым хачу адзначыць, што на кірмашах рэалізоўваецца не толькі плодаагародніннная, але і мясная, і прадукцыя прадпрыемстваў Белкаапсаюза, мёд, саджанцы. Жывая рыба прапануецца ў абавязковым парадку. Дзяржаўнае аб'яднанне «Белводгас» прымае актыўны ўдзел не толькі на асноўнай пляцоўцы, але і ў раённых кірмашах».

Калі казаць пра склад удзельнікаў, то, вядома, пераважная большасць — фізічныя асобы. Людзі з нецярпеннем чакаюць час кірмашоў, каб рэалізаваць лішкі прадукцыі, і адказна ставяцца да спажыўцоў. Многія гандляры забяспечваюць дастаўку набытых прадуктаў да пад'езда.

«Па рашэнні Мінгарвыканкама мы плануем праводзіць кірмашы выхадного дня да 26 лістапада, але гэта з улікам спрыяльных умоў надвор'я. У адпаведнасці з дзеючымі санітарнымі нормамі і правіламі, калі тэмпература паветра будзе складаць ніжэй за тры градусы са знакам плюс, на адкрытым паветры гародніну прадаваць нельга. Таму будзем арыентавацца і своечасова інфармаваць нашых спажыўцоў. Спадзяёмся, што як і летась дапрацуем да канца лістапада і надвор'е будзе спрыяць», — падагульніла Алена Нагорная.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**